**А.М. Макарэвіч (Магілёў)**

**Творы Я. Коласа, В. Быкава, У. Караткевіча ў кантэксце падрыхтоўкі да ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення (сёмы клас, другі блок урокаў)**

***Метадычныя зыходныя*.**

На сучасным этапе выкладання літаратуры ў сярэдняй школе важным фактарам з'яўляецца арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній (больш падрабязна пра гэта – [3, с.64–65]).

"Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне…" (ПКТП) прапаноўвае ў сёмым класе наступную тэму для другога ўрока развіцця маўлення (УРМ): *вуснае апавяданне на падставе ўласных назіранняў за падзеямі, якія адбываліся з вучнямі, іх блізкімі і знаёмымі, пры непасрэднай прысутнасці вучняў* [4] – фактычна сямікласнікі павінны падрыхтаваць апавядальную гісторыю. У сувязі з адзначаным вышэй ахарактарызуем, як можна здзяйсняць паралельную падрыхтоўку вучняў да такога вуснага апавядання ў кантэксце другога блока ўрокаў у сёмым класе (**Структура другога блока**. Раздзел з вучэбнага дапаможніка "Вершаваныя і празаічныя мастацкія творы": **а)** урок № 7 – Якуб Колас. "Ручэй"; урокі № 8 – 10 – Васіль Быкаў. "Незагойная рана"; **б)** урок № 11 – урок пазакласнага чытання (УПЧ) – Уладзімір Караткевіч "Сівая легенда"; **в)** урок № 12 – УРМ – непасрэдная падрыхтоўка да вуснага апавядання).

Вызначым, прычыны паводле якіх для УПЧ аддадзена перавага твору У. Караткевіча, а не "Казкам астранаўта" Р. Баравіковай, як гэта прапануе ПКТП. **1**. Жанравыя формы "Сівой легенды" – апавядальная гісторыя – і творчай работы па УРМ супадаюць. **2**. Матэрыял аповесці У. Караткевіча дае школьнікам узор змястоўнай, пераканальнай, захапляльнай формы вуснага ўзнаўлення не толькі ўласных назіранняў апавядальніка, а і сведчанняў іншых людзей, якія пераказваюцца галоўным апавядальнікам. Тут можна правесці паралель з вызначанымі ПКТП мэтамі для УРМ. "*Выпрацоўваць навыкі маналагічнага маўлення пры падрыхтоўцы вуснага апавядання на падставе ўласных назіранняў за падзеямі, якія адбываліся з вамі, вашымі блізкімі і знаёмымі, пры вашай непасрэднай прысутнасці*" [4]. Акрамя гэтага, кампазіцыя "Сівой легенды" можа стаць для вучняў пераканальным узорам прапанаванай ПКТП "Схемы будовы апавядальнага тэксту": "*1. Уступ. 2. Паведамленне пра месца і час, калі адбывалася падзея. 3. Знаёмства з дзейнай асобай (альбо некалькімі). 4. Непасрэдныя дзеянні, іх асаблівасці і парадак. 5. Указанне на завяршэнне дзеяння. 6. Вывад (раскрыць павучальны сэнс гэтай гісторыі)*" [4]. **3**. Знаёмства вучняў з гістарычным мінулым Бацькаўшчыны і – адпаведна – лёсам яе дзяцей на прыкладзе "Незагойнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раны” В. Быкава і “Сівой легенды” У. Караткевіча дае магчымасць выхоўваць у вучняў павагу да гэтага мінулага, непрымірымыя адносіны да негатыўнага ў характары чалавека. Акрамя гэтага, названыя творы ўтрымліваюць узор самаахвярнасці для захавання і памнажэння любові да блізкіх і родных па духу людзей.

***Рэкамендацыі і заданні на перспектыву*** (агучваюцца настаўнікам ва ўступнай частцы да гэтага блока ўрокаў) маюць наступныя мэты: паралельная падрыхтоўка пры вывучэнні твораў Я. Коласа, В. Быкава, У. Караткевіча да выканання творчага задання па ўроку № 12 (форма такой падрыхтоўкі – вылучэнне ў працэсе чытання і абмеркавання твораў прыкладаў такіх сродкаў мастацкага ўзнаўлення мінулых падзей у форме апавядальнай гісторыі, якія спатрэбяцца сямікласнікам пры падрыхтоўцы іх вусных апавяданняў). Мэтазгодна агучыць “Схему будовы апавядальнага тэксту” [3] і ў адпаведнасці з ёй прапанаваць вучням вызначыцца з тэмай, героямі, кампазіцыяй будучага іх вуснага апавядання. Прыватныя заданні да УПЧ: а) пачаць чытаць аповесць У. Караткевіча “Сівая легенда”; б) у працэсе ўспрымання твора неабходна выконваць прапанаваныя настаўнікам заданні, эфектыўнае выкананне якіх дапаможа якасна падрыхтавацца да творчай работы па УРМ.

***Паралельная падрыхтоўка на ўроках па творах Я. Коласа, В. Быкава да вуснага апавядання***.

**Урок № 7**[1]. *Якуб Колас. “Ручэй” – выпрацоўваць уменне заўважаць дэталі і перадаваць іх, выкарыстоўваючы прыём вуснага малявання* [4].

У працэсе адказу на пятае пытанне з вучэбнага дапаможніка (“*Чым дасягаецца мастацкая выразнасць мовы?*”) [1, с. 29] арганізоўваць працу вучняў мэтазгодна такім чынам, каб вынікі яе сталі падрыхтоўчым этапам да будучага вуснага апавядання па УРМ. Пасля працы з гэтым пытаннем можна прапанаваць вучням змадэляваць падзейную сітуацыю, якая будзе пакладзена ў аснову іх будучага вуснага апавядання, і падабраць да ўдзельнікаў яе, іх учынкаў эпітэты і параўнанні.

**Урок № 9**. *Васіль Быкаў. “Незагойная рана”. Вобраз галоўнай гераіні твора – выпрацоўваць уменне вызначаць ролю бытавых дэталяў, успамінаў <…> у раскрыцці душэўнага стану маці, драматызму становішча старой Тэклі; спыніцца на мастацкіх прыёмах, якія дапамагаюць аўтару раскрыць пачуцці маці; акцэнтаваць увагу на майстэрстве аўтара ў паказе жыцця гераіні на працягу адных сутак* [4].

У працэсе працы з другой часткай трэцяга пытання вучэбнага

[1] Тут і далей вызначаюцца тыя мэты і, адпаведна, прапаноўваюцца толькі тыя формы працы, якія спрыяюць падрыхтоўцы вучняў да УРМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дапаможніка (“*Якім чынам, пры дапамозе якіх прыёмаў дасягаецца адлюстраванне амаль усяго жыцця старой Тэклі?*” [1, с. 47]) варта вызначыць ролю такога прыёму, як рэтраспекцыя ў працэсе адлюстравання падзей у невялікай апавядальнай форме. У сувязі з гэтым можна прапанаваць вучням наступныя формы працы: **а**) знайсці ў апавяданні рэтраспекцыі (згадка Тэклі пра адыход сына на вайну, паказальныя факты з “*шаснаццаці год чакання*” Васілька – [1, с. 34 - 35]; матчын успамін пра нараджэнне, дзяцінства, юнацтва і трагічныя прадказанні сына, пра доўгае цярплівае чаканне яго – [1, с. 37 - 40]); **б**) вызначыць асаблівасці ўключэння рэтраспекцый у асноўныя падзеі: раптоўнасць ці заканамернасць узнікнення ўспамінаў (гэтыя ўспаміны заканамерныя, яны сведчаць пра вытокі Тэкліных цяперашніх пакут, узмацняюць у свядомасці чытача пачуццё спагады, перажывання за збалелае сэрца маці і яе лёс), а таксама формаўтваральныя прыклады паяднання рэтраспекцый з асноўнымі падзеямі.

Такая ці падобная да яе праца спрыяе, акрамя іншага, эфектыўнаму будучаму ўспрыманню вучнямі рэтраспекцый з аповесці У. Караткевіча “Сівая легенда”, а таксама падрыхтоўцы сямікласнікаў да УРМ: у сваіх вусных апавяданнях яны могуць выкарыстаць падобныя формы рэтраспекцый і асаблівасці іх спалучэння з асноўным тэкстам.

Вызначэнне прыкмет псіхалагічнага партрэта, ролі побытавых дэталяў у апавяданні “Незагойная рана” таксама садзейнічае эфектыўнай падрыхтоўцы вучняў да ўрокаў ПЧ і РМ. Таму мэтазгодна прапанаваць вылучыць у апавяданні знешнія дэталі партрэта яе гераіні і вызначыць іх сэнсаўтваральную ролю (характарызуюць душэўныя перажыванні Тэклі, асаблівасці ладу яе жыцця). Пасля вылучэння побытавых дэталяў варта таксама звярнуць увагу на іх сэнсавую нагрузку (падкрэсліваюць абыякавасць Тэклі да таго, што для іншых людзей з’яўляецца важным атрыбутам іх паўсядзённага жыцця, акцэнтуюць увагу на яе засяроджанасці на галоўным: чаканні сына).

**Урок № 10**. *Васіль Быкаў. “Незагойная рана”. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці характараў – вызначыць ролю пейзажу ў раскрыцці настрояў, перажыванняў гераіні* [4].

У працэсе працы з першай часткай трэцяга пытання вучэбнага дапаможніка (“*Як раскрываюцца перажыванні Тэклі праз замалёўкі прыроды (пейзаж)?*” [1, с. 48]) варта пасля вылучэння пейзажных дэталяў, замалёвак прыроды суаднесці “настрой” прыроды і настрой гераіні апавядання (яны аднолькавыя паводле іх танальнасці), а затым вызначыць сэнсавую нагрузку такога падабенства (змрочныя карціны, дэталі пейзажу падкрэсліваюць безвыходнасць і безнадзейнасць становішча Тэклі; змрочнасць прыроды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яшчэ болей узмацняе трагізм становішча галоўнай гераіні твора).

Адна з форм падрыхтоўчай працы да УРМ на гэтым этапе – дапаўненне партрэтнымі дэталямі, пейзажнымі элементамі змадэляванай вучнямі на ўроку № 7 падзейнай сітуацыі, якая будзе пакладзена ў аснову іх будучага вуснага апавядання.

**Урок № 10 (УПЧ)** – аповесць У. Караткевіча “Сівая легенда”.

Змест характарыстыкі гэтага твора можа вызначацца зместам прадстаўленых ніжэй заданняў, якія вучні павіны выканаць у працэсе чытання аповесці (яны прапаноўваюцца на ўроку № 7).

**1.** Вызначыць прыкметы апавядальнай гісторыі ў творы.

**2.** Ахарактарызаваць асноўныя прычыны канфлікту паміж героямі, лёс якіх узнаўляе Конрад Цхакен.

**3.** Знайсці часткі твора, у якіх прадстаўлены самахарактарыстыкі апавядальніка, і вызначыць іх форму і змест.

**4.** Вызначыць прадмет успамінаў апавядальніка.

**5.** Выявіць змест уражанняў і вывадаў Конрада Цхакена.

**6.** Прасачыць, у якіх абставінах і як праяўляюцца характары герояў, пра лёс якіх апавядае Конрад Цхакен.

**7.** Ахарактарызаваць кампазіцыю аповесці.

**8.** Знайсці прыклады выяўленчых сродкаў, што спрыяюць раскрыццю пісьменнікам сутнасці характару літаратурных герояў, канфліктаў паміж імі, – *мастацкія тропы* (эпітэт, параўнанне, метафара); *формы выражэння пазіцыі літаратурных герояў* (маналог, дыялог, спрэчка); *мастацкія падрабязнасці* (партрэт, пейзаж); *формы выражэння ацэначнай пазіцыі апавядальніка* (каментарыі, заўвагі, рэзюме да падзей); *формы мастацкага апісання* (рэтраспекцыі: сведчанні-ўспаміны).

**9.** На падставе выкананых у працэсе чытання аповесці заданняў дапоўніць змадэляваную на ўроках №№ 7, 10 падзейную сітуацыю для вуснага апавядання наступным: а) самахарактарыстыкі апавядальніка; б) вызначэнне абставін, у якіх будуць праяўляцца рысы характару героя (-яў) апавядання; в) формы выражэння ацэначнай пазіцыі апавядальніка; г) мастацкія тропы і падрабязнасці.

**Урок № 12** – УРМ.

**1.** На ўступным этапе падрыхтоўкі вусных апавяданняў трэба прыгадаць наступнае: **а)** “Схему будовы апавядальнага тэксту”; **г)** галоўную ўмову творчай работы: змест апавядання павінен грунтавацца на “*уласных назіраннях за падзеямі, якія адбываліся з вамі, вашымі блізкімі і знаёмымі, пры вашай непасрэднай прысутнасці*” [4]; **в)** папярэднія падрыхтоўчыя этапы да УРМ, змест і формы напрацовак вучняў, якія яны могуць выкарыстаць у сваіх вусных апавяданнях.

**2.** Падрыхтоўка разгорнутых пісьмовых тэзісаў кампазіцыі апавядання з улікам наступных парад. **А**. **Уступ**. Вызначэнне прычын, фактаў (не навучальнага плану) з цяперашняга жыцця, у сувязі з якімі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

вучань-апавядальнік узнаўляе пэўную гісторыю. Пры гэтым варта сарыентаваць школьнікаў на такую лагічную мадэль уступа да апавядальных гісторый: нейкая падзея, якісьці факт, пэўны чалавек з яго ўчынкам і інш. (усё – з рэальнага жыцця) падпіхнулі расказаць пэўную гісторыю з мэтай не толькі ілюстрацыі, а і павучання. **Б**. **Асноўная частка**. **Б - 1**. Вызначэнне часу, месца падзей, асаблівасцей іх назірання апавядальнікам (збоку – без удзелу ў падзеях, з цэнтра падзей –апавядальнік з'яўляецца непасрэдным іх удзельнікам). **Б -2** . Апавядальная рэпрэзентацыя: **а**) інтрыга гісторыі; **б**) умовы яе здзяйснення – месца, абставіны; **в**) прычына прысутнасці апавядальніка ва ўзнаўляемай ім сітуацыі; **г**) удзельнікі гісторыі – узрост, знешнасць, асаблівасці характару і інш. **Б - 3**. Вызначэнне парадку, фіналу дзеянняў удзельнікаў гісторыі, а таксама фактаў праяўлення іх характару. **Б - 4**. Падбор выяўленчых сродкаў для характарыстыкі герояў і падзей гісторыі. **В. Заключэнне**. Меркаванні пра маральныя вывады з гісторыі (у працэсе канчатковай рэалізацыі задумы апавядання яны могуць карэкціравацца).

**3.** Рэпрэзентацыя асобнымі вучнямі кароткіх анатацый іх апавядальных гісторый.

**4.** Дамашняе заданне. **1**. Падрыхтаваць пісьмовы варыянт апавядання на падставе ўласных назіранняў (пісьмовы варыянт падразумявае адпаведны ўзровень адказнасці за граматычнае, моўнае афармленне выказвання, логіку прадстаўленых у ім аргументаў, доказаў). **2**. Навучыцца вусна пераказваць падрыхтаванае апавяданне.

Прапанаваныя тут этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць: а) паэтапнаму назапашванню неабходных для выканання творчай работы фактаў з мастацкай літаратуры – гэта адна з галоўных умоў падрыхтоўкі да УРМ; б) фарміраванню ўменняў вобразных выказванняў, прыўнясенне ў іх суб'ектыўна-ацэначных элементаў на падставе ўспрымання мастацкіх твораў і суаднясення іх вобразаў з аб'ектамі і з'явамі рэчаіснасці. Акрамя гэтага, усё адзначанае садзейнічае фарміраванню ў сямікласнікаў уменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроку) па сістэме перспектыўных ліній.

Літаратура

1. Лазарук, М.А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. установ з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук, Т.У. Логінава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 304 с.

2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У.Караткевіч. Мінск : Маст. літ., 1988. – Т. 2. Аповесці, апавяданні, казкі. – С. 5 – 72.

3. Макарэвіч, А.М. Творы беларускай дзіцячай літаратуры ў кантэксце ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення ў пятым класе (Агульнаметадычны аспект) / А.М.Макарэвіч // Веснік МДУ імя А.А.Куляшова. – 2012. – № 1 (39). – 64 – 72.

4. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадмеце “Беларуская літаратура” на 2010/2011 навучальны год (V клас агульнаадукацыйных установ з беларускай і рускай мовамі навучання) // http://www.adu.by/modules.php?name=News&file=article&sid=6603 Дата доступу : 09.03.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ